**ВОДГУК**
навуковага кіраўніка Саверчанкі Івана Васільевіча,
доктара філалагічных навук, прафесара

на дысертацыю
Косцінай Жанны Вячаславаўны
«Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя»,
прадстаўленую на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура.

Дысертацыйнае даследаванне Ж. В. Косцінай «Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя» прысвечана вельмі важнай і актуальнай з пункту погляду гісторыі беларускай літаратуры праблеме і мае як агульнатэарэтычнае значэнне, што звязана з мадэлямі ўвасаблення эстэтычнага ідэалу ў мастацкай літаратуры, так і практычнае, паколькі дазваляе высветліць ідэйна-тэматычную і фармальна-змястоўную своеасаблівасць літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Актуальнасць дысертацыйнага даследавання Ж.В. Косцінай абумоўлена таксама і тым, што да гэтага часу праблема эстэтычнага ідэалу шматмоўнай літаратуры Беларусі ўказанага перыяду, звязанага з эстэтыкай і філасофіяй еўрапейскай культуры канца XVIII – першай паловы XIX стагоддзя, не атрымала поўнага і ўсебаковага вывучэння. Бясспрэчна, прадстаўленае да абароны даследаванне Ж. В. Косцінай у значнай ступені закрывае існуючую лакуну ў выяўленні асаблівасцей развіцця літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

Навуковая навізна дысертацыйнай працы Ж. В. Косцінай абумоўлена тэарэтычным абгрунтаваннем спосабаў праяўлення эстэтычнага ідэалу ў мастацкім творы, выяўленнем ролі рамантычнай іроніі ў творчасці першай паловы XIX стагоддзя, раскрыццём духоўна-хрысціянскай і гісторыка-патрыятычнай тэматыкі як дамінуючай у літаратуры данага перыяду, а таксама вызначэннем ролі слова як эстэтычнай рэальнасці ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

Дысертацыйнае даследаванне Ж. В. Косцінай з’яўляецца поўнасцю самастойным, арыгінальным і выканана на высокім навуковым ўзроўні з улікам найноўшых дасягненняў беларускіх, расійскіх і польскіх вучоных у галіне гуманітарных дысцыплін.

Палажэнні, якія выносяцца на абарону, сфармуляваны саісальнікам дакладна і пераканаўча. Зробленыя ў рабоце вывады падмацаваны багатым фактычным матэрыялам і аналізам мастацкіх твораў, які зроблены на высокім навуковым ўзроўні. Усё гэта, узятае разам, робіць дысертацыйнае даследаванне Ж. В. Косцінай істотным дасягненем сучаснага нацыянальнага літаратуразнаўства аб літаратуры першай палове XIX стагоддзя.

Асноўныя палажэнні дысертацыі Ж. В. Косцінай атрымалі грунтоўную апрабацыю на навуковых канферэнцыях, з неабходнай паўнатой выкладзены ў 28 навуковых публікацыях, з якіх 8 – артыкулы ў перыядычных выданнях,

рэкамендаваных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў.

Структура і афармленне дысертацыі «Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя» поўнасцю адпавядаюць патрабаванням, якія ўстаноўлены Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь.

Косціна Жанна Вячаславаўна за перыяд навучання (2019 – 2024 гг. на форме атрымання адукацыі "саіскальніцтва") і працы над дысертацыяй зарэкамендавала сябе як удумлівы, высокакваліфікаваны даследчык-літаратуразнаўца, які валодае навыкамі самастойнага навуковага аналізу, уменнем рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні.

Лічу, што Ж.В. Косцінай можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура **ЗА**:

- выяўленне дамінуючай тэматыкі творчасці полілінгвістычных пісьменнікаў першай паловы XIX стагоддзя і абгрунтаванне ключавой ролі паэтычнай эмоцыі ў творчасці паэтаў-пачынальнікаў;
- вызначэнне мастацкіх функцый рамантычнай іроніі як эстэтычнага прынцыпу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, што прадстаўлена як тып творчага мыслення і аснова кампазіцыйнага мадэлявання твораў прадстаўнікоў прыгожага пісьменства акрэсленага перыяду;
- выяўленне сутнасці паняцця "эстэтычны ідэал" як нормы аб эстэтычнай дасканаласці мастацкага твора і яго рэлятывізацыі з "філасофіі мастацтва" ў літаратуразнаўства;
- даследаванне культурных канстант і сімвалаў прэцэдэнтных раслін і локусаў, якія ў сукупнасці выяўляюць спецыфіку літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя і з'яўляюцца практычна-значнымі для літаратуразнаўчага аналізу з пазіцый высвятлення эстэтычнага ідэалу.

Навуковы кіраўнік
доктар філалагічных навук,
прафесар І. В. Саверчанка

Подпіс Саверчанка І. В.
СВЕДЧУ
Вядучы спецыяліст па кадрах
А. В. Занкава
16 10 2024